# Хараство намітkі

У сталічнай публічнай бібліятэцы № 5 адбылося другое пасяджэнне Клуба творчых жанчын «Спадарыня», створанага пры Мінскім гарадскім аддзяленні Саюза пісьменнікаў Беларусі. Прайшло яно пад назвай «Тры Вольгі»: сябрам клуба была прадстаўлена творчасць паэтэс Вольгі Шпакевіч, Вольгі Норынай і Вольгі Сакаловай.

Яны чыталі свае вершы, знаёмілі сябровак па клубе з выдадзенымі кнігамі, адказвалі на пытанні. Вольга Сакалова, аўтар васьмі паэтычных кніг, кіраўнік літаратурнага аб'яднання «Натхненне», нядаўна адзначыла юбілей. Павіншаваў Вольгу Міхайлаўну старшыня МГА СПБ Міхась Пазнякоў. Уручыў і ўзнагароду — медаль «За вялікі ўклад у літаратуру».

Апроч таго, на пасяджэнні клуба творчыя жанчыны вучыліся навіваць намітку. Як гэта рабіць, паказвала дацэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Любоў Сівурава. Між іншым, сапраўдную намітку (а Любоў Пятроўна свае наміткі, якім больш за 100 гадоў, атрымала ў спадчыну ад бабулі і прабабулі) большасць з сяброў клуба пабачылі ўпершыню. Любоў Сівурава распавяла пра сакральную ролю хусткі, фартуха, гарсэта, кашулі і спадніцы ў жыцці беларускай жанчыны. І не толькі распавяла, але і... апранула сучасных кабет у нацыянальныя строі.

Напрыканцы жанчыны-творцы атрымалі прыемны падарунак: чытаў вершы і спяваў паэт-песеннік Кастусь Цыбульскі.

**Тамара БУНТА**

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ